4. Kay, A. Exploitation, Ressetlement, Mass Murder: Political and Economic Planning for German Occupation Policy in the Soviet Union, 1940–41 / A. Kay. – New-York, 2006.

5. Die deutsche Wirtschaftspolitik in den besetzen sowjetischen Gebieten 1941–1943: Der Abschlußbericht der Wirtschaftsstabes Ost und Aufzeichnungen eines Angehörigen des Wirtschaftskommandos Kiew / hrsg. und eingeleitet von Rolf-Dieter Müller. – Boppard am Rhein, 1991.

6. Schlootz, J. Deutsche Propaganda in Weißrußland 1941–1944: Eine Konfrontation von Propaganda und Wirklichkeit / J. Schlootz. – Berlin, 1996.

7. Gerlach, Ch. Kalkulierte Morde. Die Wirtschafts- und Vernichtungspolitik in Weißrußland 1941 bis 1944. 2. Auflage / Ch. Gerlach. Hamburg, 2000.

8. Chiari, B. Alltag hinter der Front: Besatzung, Kollabaration und Widerstand in Weißrußland 1941–1944 / B. Chiari. – Düsseldorf, 1998.

9. Бартушка, М. Партызанская вайна ў Беларусі ў 1941–1944 гг. / М. Бартушка. – 3-е выд. – Смаленск, 2014.

10. Brakel, A. Unter Rotem Stern und Hakenkreuz: Baranowicze 1939 bis 1944. Das westliche Weißrußland unter sowjetischer und deutscher Besatzung / A. Brakel. – Paderborn; München; Wien, Zürich, 2009.

11. Karlikowski, J. Polityka okupacyjna III Rzeszy w Okręgu Bialostokim, 1941–1944 / J. Karlikowski. – Bialystok, 1965.

12. Łuczak, Cz. Polityka ludnosciowa i ekonomiczna hitlerowskich Niemiec w okupowanej Polsce / Cz. Łuczak. – Poznan, 1979.

13. Туронак, Ю. Беларусь пад нямецкай акупацыяй / Ю. Туронак. – Мінск, 1993.

14. Madajczyk, Cz. Faszyzm i okupację 1938–1945: wykonywanie okupacji przez panstwa Osi w Europie: 2 t. / Cz. Madajczyk. – Poznan, 1983–1984. – Т. 1–2.

15. Всенародная борьба против экономическнх мероприятий фашнстских оккупантов на Украине (1941 – 1945 гг.). – Киев, 1980.

16. Украинская ССР в Великой Отечественной войне Советского Союза 1941–1945 гг.: в 3 т. / ред. колл.: И. Д. Назаренко [и др.]; пер. с укр. – Кіїв, 1975.

17. Перехрест, О. Г. Сільське господарство України в роки Великої Вітчизняної війни (1941–1945 рр.) / О. Г. Перехрест / НАН України, Ін-т історії Українн. – Кіїв, 2010.

18. Мировые войны XX ст. – Кн. 4: Вторая мировая вайна. Документы и материалы. – М., 2002.

19. Великая Отечественная вайна (1941–1945 гг). Военно-исторнческие очерки: в 4 кн. / под ред. В. А. Золотарёва і Г. Н. Севостьянова). – М., 1998.

20. 1941 год: страна в огне: истор.-док. изд.: в 2 кн. Кн. 1: Очерки; Кн. 2: Документы и материалы. – М., 2011.

*І. І. ШАЎЧУК (Брэст), Г. У. КАРЗЕНКА (Мінск)*

# АКАДЭМІЯ НАВУК БССР У ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ: АГЛЯД НАВУКОВАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук айчынная гістарыяграфія з 1940-х гг. надавала пэўную ўвагу. Яна знайшла адлюстраванне ў публікацыях тагачасных прэзідэнтаў акадэміі: аб'ёмістым артыкуле М. І. Грашчанкава «Академия наук Белорусской ССР», змешчаным у зборніку, прысвечаным акадэміям навук саюзных рэспублік [6, 35–72], трох выданнях кнігі В. Ф. Купрэвіча «Академия наук Белорусской ССР. Очерк историн н деятельности» (1957, 1958 і 1968 гг.) [18].

Праца па вывучэнні дзейнасці НАН Беларусі актывізавалася і набыла сістэмны характар пасля стварэння па ініцыятыве прэзідэнта акадэміка М. А. Барысевіча, групы па вывучэнні гісторыі навукі ў складзе Інстытута гісторыі (1973 г., 1980 г. – аддзел, кіраўнік П. Ц. Петрыкаў). Першым значным вынікам навуковых пошукаў яе супрацоўнікаў і вялікага аўтарскага калектыву стала выданне гісторыі Акадэміі навук у 1979 г. [1].

Такім чынам, патрэбы развіцця айчыннай навукі, пільна адчутыя кіраўніком Акадэміі, не толькі знайшлі выйсце ў інстытуалізацыі гісторыка-навуковых даследаванняў, але мелі вынікам стварэнне фундаментальнай гісторыі навуковага цэнтру рэспублікі. Працягам гэтых працэсаў стала стварэнне шэрагу прац, прысвечаных асобным установам НАН Беларусі [25]. У большасці іх перыяду Вялікай Айчыннай вайны – лёсу супрацоўнікаў і асноўным накірункам дзейнасці – нададзена толькі фрагментарная ўвага. Гэта заканамерна, паколькі ў невялікіх аб'ёмах, як правіла, юбілейных выданняў, стварыць шырокую панараму ваеннага мінулага ўстаноў наўрад ці магчыма.

Больш падрабязна гэты перыяд апісваецца ў артыкуле М. І. Грашчанкава і, зразумела, кнізе В. Ф. Купрэвіча. Выдзяляецца калектыўная манаграфія, апублікаваная ў 1979 г., дзе асобны трэці раздзел спецыяльна прысвечаны функцыянаванню Акадэміі ў гады Вялікай Айчыннай вайны («Академия наук в период Велнкой Отечественной войны») [5, с. 47–58] і пасляваеннага аднаўлення («Академия наук в годы послевоенного восстановления») [19, с. 58–77]. У працы выдзелены наступныя часткі: пачатак вайны і эвакуацыя акадэмічных падраздзяленняў, прафесійная дзейнасць вучоных у розных арганізацыях савецкага тылу, вызваленне Беларусі і аднаўленне Акадэміі навук. Звернута некаторая ўвага на дзейнасць навукоўцаў у нямецкім тыле і на франтах вайны ў складзе рэгулярных фарміраванняў Чырвонай Арміі. Да безумоўна станоўчага моманту можна аднесці тое, што ўсе падзеі, працоўныя і ваенныя, не безасабовыя, а разглядаюцца праз прызму ўнёску ў навуку і баявыя справы канкрэтных людзей. Такім чынам, выданнем «Академни наук Белорусской ССР» былі закладзены асноўныя накірункі наступнага, больш дэталёвага вывучэння яе гісторыі.

Тэма АН БССР перыяду Вялікай Айчыннай вайны атрымала працяг у манаграфіі старшага навуковага супрацоўніка аддзела гісторыі навукі М. У. Токарава [26]. У спецыяльным раздзеле (с. 93–156) выдзяляюцца чатыры параграфы: «Арганізацыя працы вучоных акадэміі ў савецкім тыле», «Унёсак беларускіх вучоных ва ўмацаванне абароназдольнасці краіны», «Удзел супрацоўнікаў АН БССР на франтах, у партызанскіх фарміраваннях і партыйным падполлі», «Навукова-арганізацыйная дзейнасць АН БССР пасля вызвалення Беларусі». Па сутнасці, аўтар развівае палажэнні, закладзеныя раней ў калектыўнай манаграфіі. Аўтарам шырока прадстаўлены архіўныя матэрыялы з Цэнтральнага навуковага архіва НАН Беларусі, якія раней у навуковы зварот не ўводзіліся. Разам з тым, і ў калектыўнай, і індывідуальнай манаграфіях прадэманстраваны розныя падыходы ў рэканструкцыі працэсу пасляваеннага

аднаўлення. Гэта адлюстравана нават у назвах адпаведных раздзелаў: «Акадэмія навук у гады пасляваеннага аднаўлення» («Академия наук Белорусской ССР», 1979 г.) і «Навукова-арганізацыйная дзейнасць АН БССР пасля вызвалення Беларусі» (М. У. Токараў).

Для лепшага разумення структуры наступнага тэксту мусім зазначыць дзве акалічнасці. Першая: пры аналізе гісторыка-навуковай праблемы даследчыкам, чыёй базавай спецыяльнасцю з'яўляецца пэўная навука, заўсёды адбываецца своеасаблівы ўхіл менавіта ў яе, што ёсць аксіёма ў супольнасці гісторыкаў навукі. Другая: сярод акадэмічных вучоных найбольшай актыўнасцю ў вывучэнні гісторыі сваёй установы вылучаюцца гісторыкі. Імі на працягу сямнаццаці гадоў выдадзена дзве брашуры і адна калектыўная манаграфія, у якіх адлюстраваны шлях, пройдзены ўстановай з 1929 г. да, адпаведна, 1992 [8], 1999 [10], 2009 гг. [9]. Мусім звярнуць увагу, што брашура 1999 г. канцэптуальна нічым не адрозніваецца ад папярэдняй. Нязначныя адрозненні ёсць у фактычным матэрыяле, за выключэннем новай інфармацыі за 1993–1999 гг., а адзін раздзел (аўтар У. І. Навіцкі) дык і ўвогуле амаль цалкам перапісаны з першай брашуры (1992) [гл. падрабязней: [27, с. 69–78]. М. У. Токараў яшчэ раз звярнуўся да тэмы вайны. У 1992 г. гэты перыяд асобна нават не быў выдзелены ці пазначаны ў змесце. А з 13 старонак раздзела «Стварэнне і развіццё Інстытута гісторыі АНБ (1929–1941 гг.)» яму прысвечаны толькі дзве (с. 11, 19).

Такая звышканспектыўнасць некалькі пераадолена ў наступным выданні. Скарэктаваная і назва: «Утварэнне і дзейнасць Інстытута гісторыі ў 30-я гг. і ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны». Цяпер 1941–1945 гг. адведзена 3,5 старонкі. Праўда, і тут М. У. Токараў паўтарае нічым не верыфікаваную інфармацыю пра акадэміка М. М. Нікольскага, «які падтрымліваў сувязь з партызанамі» (с. 19), што пацвярджаецца хіба толькі словамі самога М. М. Нікольскага. Наконт «сувязі» трэба мець на ўвазе, што ў чэрвені 1943 г. Прэзідыум АН, СНК і ЦК КП(б)Б не мелі даных пра лёс сямі акадэмікаў, у тым ліку і пра М. М. Нікольскага [20, арк. 66]. Відавочна, што сціпласць тэксту, а адсюль і нізкая інфарматыўнасць, абумоўлены у вызначальнай ступені фарматам выдання, зададзеным рэдактарам брашуры дырэктарам інстытута М. П. Касцюком.

Гэтая «сціпласць» у пэўнай меры пераадолена ў раздзеле «Станаўленне, развіццё і дзейнасць Інстытута гісторыі. 1929–1945 гг.» (І. І. Шаўчук, с. 7–42) калектыўнай манаграфіі «Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (1929–2009 гг.)». Тут адпаведны перыяд заняў шэсць старонак. Аўтар сканцэнтраваў увагу на навуковых падзеях, што мелі месца ў савецкім тыле: больш поўна прадстаўлены асобы, што займаліся даследчыцкай працай, яе планы, вынікі, працэс аднаўлення інстытута і інш. У раздзеле толькі называюцца прозвішчы франтавікоў, партызан і падпольшчыкаў, шырэй за папярэднія брашуры пададзены аднаўленчыя мерапрыемствы. Абмежаванне 1945 г. абумоўлена структурай кнігі, распрацаванай рэдакцыйным саветам. Наступная пяцігодка аднаўлення Акадэміі навук прадстаўлена ў раздзеле «Станаўленне, развіццё і дзейнасць Інстытута гісторыі. 1946–1970 гг.» (Л. П. Каян, с. 43–66).

Але тут структурна не выдзяляецца адпаведных навукова-арганізацыйных мерапрыемстваў, інфармацыя пра іх размеркавана па ўсім тэксце.

Спецыяльныя даследчыцкія намаганні па вывучэнні гісторыі інтэлігенцыі, якая аказалася на часова акупаванай тэрыторыі, сканцэнтраваў У. І. Кузьменка. Плёнам яго працы сталі некалькі манаграфій пра яе жыццё і змаганне ва ўмовах акупацыйнага рэжыму 1941–1944 гг. Вучоны не акцэнтуе увагу на акадэмічных супрацоўніках, але вялікі аб'ём яго кніг [14; 15] апавядае менавіта пра іх. Асабліва гэта тычыцца апошняга даследавання, праведзенага разам з М. У. Токаравым [17]. У значнай ступені разнастайнасць уяўленняў пра ўзнятую праблему дапаўняе серыя артыкулаў Г. У. Карзенкі [13].

Разглядаючы літаратуру па гісторыі Акадэміі навук перыяду вайны, нельга не звярнуць увагу на першую ў беларускай гістарыяграфіі спробу сінтэтычнага гістарыяграфічнага і крыніцазнаўчага аналізу тэмы «Беларусь у гады Вялікай Айчыннай вайны» [7]. У. В. Здановіч самаўпэўнена дэкларуе, што ім праведзена гістарыяграфічнае вывучэнне гісторыі Беларусі у 1941–1945 гг. (крыніцазнаўчы бок кнігі некуды бясследна з тэксту знік). Заканамерна аўтар паспрабаваў не пакінуць без увагі і навуковую інтэлігенцыю. Асноўнай гістарыяграфічнай крыніцай для яго паслужылі публікацыі У. І. Кузьменкі, што пацвярджаецца бібліяграфічным спісам з 25 пазіцый (адзін артыкул у ім згаданы двойчы з рознай колькасцю старонак і праігнараваная цікавая брашура [16]). Адзначым паказальны момант: у тэксце мы выявілі толькі 17 спасылак на працы вучонага.

Згадкі і менавіта толькі згадкі пра творы У. І. Кузьменкі прысутнічаюць ва ўсіх главах, за выключэннем першых дзвюх. Яны змешчаны ў падраздзелах «3.2 Праблемы эвакуацыі на старонках выданняў» (с. 60, 62), «4.1 Даследаванні па гісторыі партызанскага руху» (с. 75, 82), «4.2 Вывучэнне гісторыі партызанскай барацьбы» (с. 87), «5.2 Ідэалагічнае супрацьстаянне на акупіраванай тэрыторыі рэспублікі ў гістарычнай літаратуры» (с. 105, 122), «6.1 Асвятленне ратных спраў айчыннымі навукоўцамі» (с. 133), «7.1 Гістарыяграфія вызвалення Беларусі» (с. 149), «7.2 Першыя аднаўленчыя работы: распрацоўка праблемы навукоўцамі» (с. 154–156). Але ж гісторыя інтэлігенцыі прысутнічае не толькі ў працах У. І. Кузьменкі, а і ў згаданых вышэй публікацыях, у калектыўных і індывідуальных манаграфіях, прысвечаных шэрагу навуковых і вышэйшых навучальных устаноў рэспублікі і інш. Фундаментальная праца, прысвечаная 80-годдзю Інстытута гісторыі, адзіная з падобнага кшталту літаратуры, прысутнічае ў бібліяграфічным спісе выключна для «упрыгожання» і «насычэння» апошняга.

Працы У. І. Кузьменкі, паводле У. В. Здановіча, гэта і ёсць гістарыяграфічны аналіз. Прадставім вынікі рэалізацыі такой методыкі некалькімі цытатамі. Гаворачы пра эвакуацыйныя мерапрыемствы лета 1941 г., аўтар адзначае: «Некаторыя звесткі аб гэтым (працы «розных катэгорый насельніцтва ў сістэме ГУЛАГу» – *Аўт.*) можна знайсці ў... манаграфіі У. І. Кузьменкі. Пра лёс супрацоўнікаў АН БССР, якія ў гады вайны працавалі на прадпрыемствах і ўстано-

вах, кантралюемых НКУС, паведамляецца ў кнізе «Возвращенные имена...»» (с. 62). Дадзеным «аналіз» вычарпаны. Між іншым, аўтара не бянтэжыць, што ў брашуры, складзенай М. У. Токаравым, няма ні слова пра нейкую працу зняволеных у ГУЛАГу, паколькі складальнік не ставіў перад сабой такіх задач, што цалкам апраўдана і аргументавана ў прадмове[1] [3]. Інфармуючы пра расійскія падлікі колькасці тых, хто ў пасляваенныя гады ўтрымліваўся ў «сістэме ГУЛАГа», У. В. Здановіч, забыўшыся да с. 154 пра напісанае на с. 62, наступным чынам падводзіць вынікі ўласных «навуковых» назіранняў (у тэксце больш нічога няма і адпаведна з тэксту яны не вынікаюць, а існуюць самі па сабе): «У сучаснай айчыннай гістарыяграфіі азначаная праблема не знайшла шырокага асвятлення. Асобныя яе сюжэты раскрыты ў працах У. І. Кузьменкі і М. У. Токарава». Аўтар, такім чынам, прадэманстраваў невалоданне літаратурай па гісторыі Беларусі перыяду Вялікай Айчыннай вайны, гісторыі навуковай інтэлігенцыі таго часу, у тым ліку акадэмічнай, і рэпрэсій, азнаёміцца з якімі «сучасная айчынная гістарыяграфія» прадстаўляе значна больш магчымасцей, чым недасканалыя бібліяграфічныя згадкі асобных публікацый двух вучоных. У. В. Здановіч прадэманстраваў таксама невалоданне методыкай тэматычнага гістарыяграфічнага даследавання. Таму відавочна, што дадзеная тэма яшчэ чакае кваліфікаванага навуковага вывучэння.

У якасці асобнай, вельмі нешматлікай групы гістарыяграфічных крыніц вылучым дакументальныя зборнікі і апублікаваныя мемуары. Сярод іх звернем увагу на зборнік успамінаў супрацоўнікаў Акадэміі навук, якія бралі ўдзел у змаганні з нямецкім фашызмам на франтах, у партызанскім і падпольным руху [4]. Цікавыя даныя пра ваенны час пакінуў рэпрэсаваны ў 1930 г. аспірант БАН Я. Я. Кіпель [11]. Дадаюць новых фарбаў да вядомай гісторыі пра вываз беларускіх вучоных з акупаванай Беларусі невялікія дзіцячыя ўспаміны кандыдата навук А. Ф. Клішына, сына даваеннай выкладчыцы і аспіранткі гісторыка М. Ф. Малаковіч, непасрэднага ўдзельніка партызанскай аперацыі эвакуацыі з Мінска ў савецкі тыл акадэміка М. М. Нікольскага і доктара тэхнічных навук, прафесара А. А. Краўцова [12, с. 440–449].

Беларуская гістарыяграфія мае некалькі дакументальных публікацый па ўзнятай тэме. Яшчэ ў 1991 г. пабачыла свет хроніка «Наука и техника Советской Белоруссии», падрыхтаваная супрацоўнікамі аддзела гісторыі навукі Інстытута гісторыі ў рамках рэалізацыі агульнасаюзнага задання «Наука и техника СССР» [22]. У ёй ваеннаму і аднаўленчаму перыядам прысвечана сямнаццаць старонак (с. 46–62). Пэўная ўвага нададзена вучоным і ўстановам АН БССР [21]. М. У. Токаравым апублікаваны біяграфічны зборнік «Военные судьбы» [2], дзе сканцэнтраваны даведкі пра «супрацоўнікаў Акадэміі навук, што працавалі ў ёй да вайны, а таксама тых, хто паступіў на працу да мая 1945 г.» Ва ўводзінах складальнік слушна пазначыў: «наяўныя матэрыялы не

---

[1] Паколькі У. В. Здановіч кажа пра «кнігу» і, зыходзячы з праведзенага ім «аналізу», можна зрабіць выснову, што ён не трымаў выданне ў руках, а абмежаваўся толькі вонкавай характарыстыкай бібліяграфічнага запісу.

дазваляюць даць поўныя звесткі пра ўсіх выяўленых удзельнікаў Вялікай Айчыннай вайны» (с. 11). Некалькі шырэй адпаведная інфармацыя прадстаўлена ў гісторыка-дакументальным летапісе, зборніку дакументаў і матэрыялаў, складзеных супрацоўнікамі аддзела сацыяльна-эканамічнай гісторыі, навукі і культуры Інстытута гісторыі да 80-годдзя НАН Беларусі [23; 24]. Далейшае развіццё закладзеных у іх сюжэтаў мае навуковую перспектыву, а ўзнятая намі тэма патрабуе больш уважлівага прафесійнага кваліфікаванага гістарыяграфічнага асэнсавання. Тым не менш агульныя напрацоўкі і высновы, зробленыя навукоўцамі, заклалі падмурак сучаснага навуковага бачання дзейнасці НАН Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны і адпаведна маюць актуальнасць і надалей.

## Крыніцы і літаратура

1. Академия наук Белорусской ССР / Н. И. Галенчик [и др]; редкол.: Н. А. Борисевич (пред.) [и др.]. – Минск, 1979.

2. Военные судьбы: сотрудники АН Беларуси – участники Великой Отечествеиной войны / сост. и авт. предисл. Н. В. Токарев; под ред. Н. А. Борисевича. – Минск, 1995.

3. Возвращенные имена: сотрудники АН Беларуси, пострадавшие в период сталинских репрессий / сост. и авт. предисл. Н. В. Токарев; под ред. А. С. Махнача. – Минск, 1992.

4. Воспоминания ветеранов Великой Отечественной войны Национальной академии наук Беларуси в реальном времени истории / сост. А. И. Головнев. – Минск, 2004.

5. Галенчик, Н. И. Академия наук в период Великой Отечествеиной войны / Н. И Галенчик, А. И. Залесский // Академия наук Белорусской ССР. – Минск, 1979.

6. Гращенков, Н. И. Академия наук Белорусской ССР / Н. И. Гращенков // Академии наук союзных республик. К тридцатилетию Великой Октябрьской социалистической революции. – М.; Л., 1947.

7. Здановіч, У. В. Беларусь у гады Вялікай Айчыниай вайны. Агляд крыиіц і айчыннай гістарыяграфіі / У. В. Здановіч; навук. рэд. А. А. Каваленя. – Брэст, 2012.

8. Институт истории Академии наук Беларуси: краткий очерк / Г. В. Корзенко [и др.]; под ред. М. П. Костюка. – Минск, 1992.

9. Институт истории Национальной академии наук Беларуси (1929–2009 гг.) / ред. А. А. Коваленя (рук.) [и др.]. – Минск: Беларус. навука, 2009. – 628 с.

10. Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі (Да 70-годдзя ўтварэння) / М. П. Касцюк [і інш.]. – Мінск, 1999.

11. Кіпель, Я. Я. Эпізоды = Episodes / Я. Кіпель; пад рэд. І. Урбановіч, З. Саўкі. – Нью-Йорк, 1998; Кіпель, Я. Я. Эпізоды / Я. Кіпель; пад навук. рэд. Н. Гардзіенкі і Л. Юрэвіча; прадмовы: З. Саўка, І. Урбановіч-Саўка, В. Кіпель. – 2-е выд., дапрац. – Мінск, 2013.

12. Клишин, А. Ф. Как партизаны спасли ученых / А. Ф. Клищин // Институт белорусской культуры и становление науки в Беларуси: к 90-летию создания Иоститута белорусской культуры: материалы Междунар. науч. конф., Минск, 8–9 дек. 2011 г. / редкол.: А. А. Коваленя [и др.]. – Минск, 2012. – С. 440–449.

13. Корзенко, Г. В. Ученые Беларуси в годы Великой Отечествеиной войны / Г. В. Корзенко // Адукацыя і выхаванне. – 2005. – № 4. – С. 14–19; Корзенко, Г. В. Деятельность научной интеллигенции Беларуси в советском тылу (1941–1944 гг.) / Г. В. Корзенко // Великая Отечественная война в исторической судьбе белорусского народа: материалы Междунар. науч.-практ. конф., посвящ. 65-летию победы в Великой Отечественной войне, Гродно, 4–5 мая 2010 г. / редкол.: А. А. Коваленя [и др.]. – Миск, 2012. – С. 290–295; Корзенко, Г. В. Ученые – для фронта и тыла / Г. В. Корзенко [и др.] // Наука и инновации. – 2010. – № 5. – С. 5–9; Корзеико, Г. В. Даследаванні навукоўцаў Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны / Г. В. Корзенко // Вес. БДПУ. Сер 2. –

2010. – № 2. – С. 3–7; Корзенко, Г. В. Роль научной интеллигенции Беларуси в укреплении советского тыла (1941 – 1944 гг.) / Г. В. Корзенко // Отечественная и мировая интеллигенция в кризисные периоды истории: материалы XXI Междунар. науч.-теорет. конф., Иваново, 23-25 сент. – Иваново, 2010. – С. 15–17.

14. Кузьменко, В. И. Интеллигенция Беларуси в период немецко-фашистской оккупации (1941–1944 гг.) / В. И. Кузьменко. – Минск, 2001.

15. Кузьменко, В. И. В суровые сороковые: интеллигенция Беларуси в Великой Отечественной войне (1941 – 1945 гг.) / В. И. Кузьменко. – Минск, 2006.

16. Кузьменко, В. И. Партизанские оружейники / В. И. Кузьменко; под ред. Э. Ф. Языкович. - Минск, 1990.

17. Кузьменко, В. И. Политика немецко-фашистских оккупационных властей в отношении научной интеллигенции Беларуси (1941–1944 гг.) / В. И. Кузьменко, Н. В. Токарев. – Минск, 2007.

18. Купревич, В. Ф. Академия наук Белорусской ССР. Очерк истории и деятельности / В. Ф. Купревич. – 3-е доп. изд. – Минск, 1968.

19. Марченко, И. Е. Академия наук в годы послевоенного восстановления / И. Е. Марченко // Академия наук Белорусской ССР. – Минск, 1979.

20. Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь. – Ф. 4п. – Воп. 33а. – Спр. 352. Докладные и справки о распространении литературы, о работе редакций газет, о работе БАН и Оперного театра. Копии статей и речей. Списки генералов и Героев Советского Союза – белорусов и др. Июль 1942 г. – июль 1943 г.

21. Наука и техника Советской Белоруссии в 1917–1990 гг.: хроника важнейших событий / сост. Г. В. Корзенко [и др.]; под ред. П. Т. Петрикова. – Минск, 1991.

22. Наука и техника СССР, 1917–1987: Хроника / сост. В. А. Волков [и др.]; редкол. Г. К. Скрябин [и др.]. – М., 1987.

23. Национальная академия наук Беларуси: 1928–2008 гг.: документы и материалы / сост.: Н. В. Василевская и [др.]; редкол. М. В. Мясникович (пред.) [и др.]. – Минск, 2008.

24. Национальная академия наук Беларуси: историко-документальная летопись, 1928-2008 гг. / Нац. акад. наук Беларуси, Ин-т истории; сост.: Г. В. Корзенко [и др.]; редкол.: М. В. Мясникович (пред.) [и др.]. – Минск, 2008.

25. Степанов, Б. И. Институт физики АН БССР – 25 лет. – Минск, 1980; Физико-технический институт АН БССР: к 50-летию ин-та / Н. И. Галенчик, Н. Ф. Клебанович, Ж. А. Мрочек [и др.]; редкол. В. Н. Чачин (пред.) [и др.]. – Минск, 1981; Институт торфа АН БССР / редкол. Лиштван И. И. [и др.] – Минск, 1983; Институт зоологии Академии наук Беларуси / под общ. ред. Л. М. Сушени [и др]. – Минск, 1992; Институт экономики Национальной академии наук Беларуси: к 70-летию создания. 1931–2001 / П. Г. Никитенко [и др.]; под ред. П. Г. Никитенко и В. С. Фатеева. – Минск, 2001; Институт земледелия и селекции НАН Беларуси: 75 лет из истории развития аграрной науки Беларуси, 1927–2002 / М. А. Кадыров (отв. ред.) [и др]. - Минск, 2003; Институт леса. – Гомель, 2005; Інстытут літаратуры імя Янкі Купалы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. 1931–2006 / У. Гніламёдаў [і інш.]. – Мінск, 2006; Институт философии НАН Беларуси: источник и символ самосознания культуры: к 80-летию института (1931–2011 гг.) / А. А. Лазаревич [и др.]; ред. совет: А. А. Лазаревич (пред.) [и др.].– Минск, 2011; Ордена Трудового Красного Знамени Государственное научное учреждение «Институт экспериментальной ботаники имени В. Ф. Купревича»: к 80-летию со дня образования / О. С. Гапиенко [и др.]; редкол.: Н. А. Ламан [и др.]. – Минск, 2011; и др.

26. Токарев, Н. В. Академия наук Белорусской ССР: годы становления и испытаний (1929-1945) / Н. В. Токарев; под ред. В. А. Полуяна. – Минск, 1988.

27. Шевчук, И. И. Институт истории Национальной академии наук Беларуси в юбилейных изданиях / И. И. Шевчук // Клио. – 2012. – № 2 (62).